**УДК 94(476.5)**

# СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА ПОЛАЦКА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТАКУ XX СТАГОДДЗЯ

***С.Л. РАМАНАЎ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы)***

*Разглядаецца праблематыка святочнай культуры Полацка ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя. Вызначаецца месца і роля горада ў ідэалагічным пераацэньванні беларускіх губерняў Расійскай імперыі пасля паўстання 1863–1864 гадоў пасродкам культывавання новых святочных традыцый. Вывучаецца структура, выгляды і формы гарадскіх свят, іх вартасныя арыентацыі. Вылучаюцца тыя святы, якія для Полацка мелі адмысловае значэнне. Вызначаюцца і аналізуюцца розныя падставы святочнасці, падабенствы і адрозненні паміж святочнымі групамі, этнарэлігійная, палітычная і культурная спецыфіка такіх свят. У высновах прыводзяцца ключавыя ідэі даследавання, вызначаюцца вядучыя тэндэнцыі і характэрныя асаблівасці святочнай культуры Полацка ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя.*

Гарадская святочная культура даволі рэдка абіраецца беларускімі даследчыкамі ў якасці самастойнага прадмета даследаванняў. Шмат часцей у даследаваннях культуры разглядаюцца “традыцыйныя” яе элементы: літаратура, музыка, тэатр, жывапіс і інш. Разам з тым святочная культура як з’ява ўжо некалькі дзесяцігоддзяў прыцягвае навуковыя інтарэсы нашых усходніх [1–4] і заходніх [5] суседзяў. У айчыннай гістарыяграфіі асобныя аспекты святочнай культуры гарадскіх паселішчаў Беларусі разглядаліся А.Р. Яшчанка [6], І.В. Соркінай [7; 8], Т. Вароніч [9]. У шырокім сэнсе гарадская святочная культура ўяўляе сабой частку духоўнай культуры гарадской супольнасці і ўключае сукупнасць усіх відаў і формаў свят і святочных традыцый, абрадаў і рытуалаў, цырымоній і звычаяў, атрыбутаў і знакаў [10, с. 3–4]. Для жыхароў імперыі ўвесь спіс дзён, якія з нагоды свят былі рэгламентаваны вольнымі ад працы, у календары звычайна пазначаўся як “табельные дни” або “неприсутственные дни”, “неприсутствия”. Такое азначэнне святочных дзён мела пад сабою іх вызначальную характарыстыку: у гэтыя дні ад працы вызваляліся ўсе “присутственные места”. Акрамя табельных дзён, якія мелі свае акрэсленыя месцы ў святочным календары, у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя асаблівую папулярнасць набывае святкаванне памятных дат гістарычных падзей, ваенных перамог і іншых юбілейных неперыядычных свят. У згаданы перыяд паўночна-заходнія губерні святкавалі наступныя юбілеі: 1862 год – 1000-годдзе Расійскай дзяржавы; 1872 – 200-годдзе з дня народзінаў Пятра I; 1877 – 100-годдзе з дня народзінаў Аляксандра I; 1885 – 1000-гадовы юбілей з дня смерці Св. Мяфодзія; 1888 – 900-годдзе хрышчэння Русі; 1892 – 500-годдзе з дня смерці Св. Сергія Раданежскага; 1896 – 100-годдзе з дня народзінаў Мікалая I; 1896 – 100-годдзе з дня смерці Кацярыны II; 1899 – 100-годдзе з дня нараджэння А.С. Пушкіна; 1900 – 100-годдзе з дня смерці А. Суворава; 1912 – 100-годдзе вайны 1812 года; 1913 – 300-годдзе праўлення дынастыі Раманавых і інш. [8, с. 296].

Аднак у шэрагу гарадоў беларускіх губерняў Полацк меў сваю спецыфіку, якая атрымала адпаведную інтэрпрэтацыю і праз святочную культуру, што было выразна акрэслена пасля падзей 1863–1864 гадоў. Як адзначаў сучаснік, “…Полоцк – древний город, издавна служивший оплотом православия в Северо-Западном крае и тем самым могущий положить в души молодых его питомцев любовь к вере отцов и дедов и желание продолжать их просветительные задачи. Кроме того, с Полоцком связаны и дорогие для каждого русского исторические воспоминания, которые должны были содействовать надлежащему воспитанию … молодежи. Полоцк славился своею древностью, как основанный в незапамятные времена; историческим значением, как стольный град Изяславичей и Гедиминовичей; торговлею, как член Ганзейского союза; силою, как главная крепость Литвы; святынями, как заключающий в себе древний Софийской храм и Спасо-Евфросиниевскую обитель” [11, с. 7].

Некалі магутны і ўплывовы, Полацк уяўляў сабою сур’ёзную пагрозу для суседзяў: ён неаднаразова станавіўся найбольш значнай крэпасцю ў шэрагу разбуральных войн другой паловы XVI – сярэдзіны XVII стагоддзя, быў месцам ваеннага супрацьстаяння Івана IV і Стэфана Баторыя – сімвалаў сваёй эпохі. Што праўда, у часы Расійскай імперыі ў заходніх губернях святкаванне любых падзей, звязаных з Рэччу Паспалітай і асобамі з яе гісторыі, было непапулярным і на афіцыйным узроўні не дазвалялася. Матывавалася гэта між іншым і тым, што гэтыя святы нібыта страцілі сваё значэнне. У той жа час 8 верасня 1881 года Пскоў гучна святкаваў 300-гадовы юбілей зняцця аблогі ад войск караля Стэфана Баторыя (7–8 верасня 1581 г.). Адзін са сведкаў гэтых падзей адзначаў: “Нельзя не отнестись с величайшим сочувствием к этому историческому празднику псковцев, и не указать на него, как на достойный подражания пример. Мы, говоря вообще, как-то мало знаем и ценим свою историю. Подобные исторические торжества могут служить общедоступным средством распространения исторических сведений, возбуждения патриотического чувства любви к родной старине и её деятелям…” [12, с. 342].

З сярэдзіны XIX стагоддзя ўплыў афіцыйнай святочнай культуры становіцца больш адчувальным, што было звязана з выпрацоўкай дакладнай ідэалагічнай пазіцыі адносна заходніх губерняў. Адным з найбольш знакавых святочных мерапрыемстваў Полацка было адкрыццё 26 жніўня 1850 года помніка ў

памяць вайны 1812 года. Але фактычна гэты помнік павінен быў падкрэсліваць адразу некалькі падзей: перамогу князя Пажарскага над палякамі пад Масквой у 1612 годзе, Барадзінскі бой 1812 года, узяцце Варшавы рускімі войскамі ў 1831 годзе, а таксама баі за Полацк 5–6 жніўня і ўзяцце горада штурмам 7 кастрычніка 1812 года [11, с. 185–187]. Адкрыццё адбывалася ў прысутнасці будучага імператара Аляксандра ІІ, які пасля сустрэчы і службы, праведзенай архіепіскапам В. Лужынскім у царкве мясцовага кадэцкага корпуса, прыняў удзел у святочных мерапрыемствах: крыжовым ходзе і арганізацыі ўрачыстага цэрыманіяльнага маршу полацкіх кадэтаў, якім і было завершана адкрыццё помніка.

Не меней урачыста была адсвяткаваная ў корпусе і праведзеная 26 жніўня 1856 года каранацыя Аляксандра ІІ. Кадэты пад кіраўніцтвам паручніка Захарчанкі наладзілі бліскучую ілюмінацыю, і вензелі цара і царыцы гарэлі featured рознакаляровымі агнямі. Народ доўга тоўпіўся па пляцы корпуса. У гэты ж дзень дырэктар корпуса атрымаў чын генерала [11, с. 207–208]. У дзень каранацыі Мікалая ІІ, 14 мая 1896 года, кадэтамі таксама было арганізавана ўрачыстае мерапрыемства, якое скончылася балем для адной з кадэцкіх рот [11, с. 305].

Аднымі з самых распаўсюджаных свят былі святы карпаратыўныя. У найвялікшай карпарацыі ва ўсёй Расійскай імперыі, якой з’яўлялася армія, у звычайнага афіцэра колькасць адных толькі карпаратыўных святочных дзён складала норму 10–12 свят у год [13, с. 46]. Такая сітуацыя вынікала з таго, што прафесійны склад і карпаратыўная культура імперскай арміі вызначалася каставасцю і надзвычай складанай структурай: існавалі палкавыя святы, а калі ў палку была свая паходная (або сталая гарнізонная) царква, то і прэстольныя святы, адзначаліся святы відаў і радоў войскаў: пяхоты (інфантэрыі), кавалерыі, артылерыі, флоту і інш. Акрамя таго, кожная структурная адзінка: батальён, рота і іншыя часцей за ўсё мелі ўласныя іконы сваіх патронаў і святкавалі дні іх памяці. У заходніх губернях, як патэнцыяльна небяспечных, у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя назіралася высокая канцэнтрацыя войскаў. У Полацку, напрыклад, размяшчаліся 15 уланскі татарскі полк, 47 драгунскі і інш. Асаблівасцю свят вайсковых навучальных устаноў было тое, што ўсе яны мелі агульнае карпаратыўнае свята – дзень Марыі Магдалены (22 ліпеня) – і разам з тым валодалі сваімі асобнымі святамі. Для Полацкага кадэцкага корпуса такімі святамі былі дні памяці Святога Мікалая. Святы такога парадку адзначаліся не толькі навучэнцамі і служачымі ваенных навучальных устаноў, але і выпускнікамі-афіцэрамі, якія складалі ў дачыненні да alma mater своеасаблівую касту. Колькасць такіх “вучэбных” святочных дзён залежыла ад вайсковай кар’еры афіцэра: як мінімум гэта былі толькі юнкерскае вучылішча, марскі або пажскі корпус; як максімум – кадэцкі корпус (часам некалькі карпусоў як вынік перамяшчэнняў), вайсковае вучылішча, усемагчымыя афіцэрскія курсы (школы, класы), вайсковая акадэмія і, нарэшце, Мікалаеўская акадэмія генеральнага штаба [13, с. 42]. Адначасова палкі і вайсковыя навучальныя ўстановы часта мелі сваіх “шэфаў”, і таму святкавалі і іх дні народзін або імянін. Шэфам часцей за ўсё з’яўлялася ўплывовая асоба (часам з царскай сям’і), якая ажыццяўляла апеку над палком або ўстановай. Апека магла быць як фармальнай, так і абсалютна рэальнай – усё залежыла ад асобы шэфа.

У 1860 годзе кадэцкі корпус сціпла адсвяткаваў свой першы, 25-гадовы юбілей. У лагерах 25 чэрвеня была адслужана паніхіда па імператары Мікалаі І, заснавальніку корпуса, затым быў праведзены кадэцкім батальёнам царкоўны парад. Да кадэцкага стала былі запрошаны таксама служачыя, а ўвечары быў спалены самаробны феерверк. У дзень адкрыцця ў Полацку кадэцкага корпуса і яго 50-гадовага юбілею 25 чэрвеня 1885 года ў паходнай царкве была здзейснена літургія па імператары Мікалаі І і вялікім князі Міхаіле Паўлавічу, але само святкаванне юбілею для зручнасці было перанесена на 6 снежня таго ж года. Свята адзначалася з асаблівай урачыстасцю і прысутнасці шматлікіх гасцей, будынкі і корпусныя залы былі ўпрыгожаны сцягамі, вянкамі і гірляндамі [11, с. 222, 274–275].

З надзвычайнай урачыстасцю было адзначана корпуснае свята ў 1902 годзе, калі фактычна ў адзін тэрмін адзначаліся тры падзеі: уласна корпуснае свята – дзень памяці Святога Мікалая; імяніны імператара Мікалая ІІ; прыезд у Полацк вялікага князя Канстанціна. Часткай свята сталі літаратурныя чытанні, праведзеныя членамі “Кружка любителей художественного чтения и музыки в Петербурге”: Ю.Э. Азароўскім, Д.М. Мусінай, В.І. Пятровым, В.В. Чэхавым. Вечарам у Аляксандраўскай зале праводзіліся танцы, якія пачыналіся вальсам. Памяшканне перад галоўнай залай было падзелена елкамі на дзве часткі. Пярэдняя палова ўяўляла сабою гасціную з мяккай мэбляй, засланую і абчэпленую дыванамі, а другая, у якую ішоў масток з бярозавымі поручнямі, была зроблена ў выглядзе напалову асветленага кута, адкуль адкрываўся від на эфектна асветленую ззаду транспарантную карціну з выявай заліва і парусной лодкі ў захадзе сонца. Зала таксама была прыгожа прыбрана, эстрада перад партрэтам імператара была ўслана дыванамі і застаўлена дэкаратыўнымі раслінамі і мэбляй. З пярэдняга боку яна была ўпрыгожана чатырма вялікімі, зробленымі пад мармур калонамі, на сярэдніх з іх стаялі пальмы, а на іншых – велізарныя гіпсавыя бюсты Зеўса і Геркулеса. Направа ад эстрады вісеў на сцяне ўпрыгожаны ружамі вялікі партрэт вялікага князя Канстанціна Канстанцінавіча – начальніка ўсіх вайсковых навучальных устаноў Расійскай імперыі. На процілеглым канцы залы з гімнастычнага абсталявання была зробленая вялікіх памераў хата, пакрытая снегам і застаўленая спераду елкамі, на галінах якіх ляжалі снежныя шматкі. Задняя сцяна ўяўляла сабою неба, усеянае зоркамі. Усярэдзіне хаты размяшчаліся музыкі. Злева на трыножніку стаяў вялікі мальберт, на якім збоку быў напісаны расклад танцаў, а ў сярэдзіне намаляваны зімовы краявід. Танцы ішлі надзвычай ажыўлена, і вечар скончыўся ў 3 гадзіны 20 хвілін ночы [11, с. 320].

З 1872 года ў Полацку існавала настаўніцкая семінарыя, вучні якой прымалі ўдзел ва ўшанаванні памяці расійскіх пісьменнікаў: адзначалі юбілеі Пушкіна, Гогаля, Жукоўскага, Тургенева і інш. У 1912 годзе з нагоды юбілею вайны 1812 года семінарыі было прысвоена імя Я.П. Кульнева – генерала, які загінуў у баі пры Клясціцах [14; 15, с. 25].

Адначасова відавочна, што Полацк меў асаблівае значэнне і ў якасці рэлігійнага цэнтра. У прыватнасці, 12 лютага 1839 года менавіта ў Полацку адбыўся сабор з мэтай ліквідацыі Брэсцкай царкоўнай уніі. Гэтая падзея, у сваю чаргу, паклала пачатак новай святочнай традыцыі: у 1864 годзе святкаваўся яе першы, 25-гадовы юбілей. Асабліва шырока ў 1889 годзе ў гарадах Беларусі адзначаўся 50-гадовы юбілей "далучэння ўніятаў". Шмат у якіх населеных пунктах: Брэсце [16, с. 288], Гродна [16, с. 260], Каменцы [16, с. 275] сучаснікі заўважалі адну асаблівасць – свята ліквідацыі ўніі, якое праводзілася 8 чэрвеня, супадала са святкаваннем каталікамі свята "Божага цела"; тая ж сітуацыя занатоўвалася і ў іншых мясцовасцях Расійскай імперыі (Стара-Канстанцінаў, Камянец-Падольскі). Для XIX стагоддзя гэта была праблема масавасці свята: у Гродна, напрыклад, адзначалася што ў параўнанні з папярэднімі Уладзімірскім (1885 г.) і Кірыла-Мяфодзіеўскім (1888 г.) юбілеямі гэта свята было больш маштабным якраз з нагоды таго, што ў гэты ж дзень у горадзе знаходзілася шмат народу з навакольных вёсак, якія былі тут "по случаю" святкавання каталіцкага свята "Божага цела" [16, с. 260]. Аднак тэхналогія "шчаслівых выпадковасцяў" рыхтавалася ў Полацку. Яе аўтарам быў полацкі архіепіскап В. Лужынскі, які разам з мітрапалітам Сямашкай прымаў актыўны ўдзел у падзеях 1839 года. У сваім дзённіку за 1840 год Лужынскі занатаваў наступнае: "Празднование повсюду унитскою церковию вмест с римскою праздника в 9-й четверг после Пасхи Тела Господня меня более всего беспокоило. Мне становилось крайне необходимым уничтожить в воссоединенных церквах сей латинский праздник. Но как приступить к тому, как решиться на это, когда столетия укрепили в народе особенное сердечное расположение к нему с живою верою в пречистое Тело Христово, котораго и приобщались после исповеди в этот праздник все немолодых лет люди? Сообразив все обстоятельства, просил я Бога, чтобы Он умудрил меня, как разрешить мне эту трудную задачу. И вот, мне и пришла прекрасная мысль, чтобы в вышеозначенный день былъ установлен самим правительством праздник в память многознаменательнаго события воссоединения греко-униатской церкви с православною для торжественнаго в оный день празднования с крестным после литургии хождением на реку для водоосвящения, а потом и вокруг церкви, где это последнее удобоисполнимо…" [17, с. 195–196]. Святочныя мерапрыемствы 1889 года прайшлі і ў Полацку, дзе асноўныя падзеі разгарнуліся ў тым самым Сафійскім саборы, дзе мела месца паседжанне 1839 года [16, с. 295–299; 18, с. 308].

Яшчэ адным, не менш значным царкоўным святам Полацка, было вяртанне ў горад астанкаў св. Ефрасінні Полацкай. Напрацягу XIX стагоддзя вышэйшыя царкоўныя іерархі 6 разоў звярталіся ў Свяцейшы Сінод з прапановай перанесці мошчы Ефрасінні з Кіева ў Полацк: гэта падзея павінна была мець адпаведны ідэалагічны падтэкст. Частка мошчаў паводле ініцыятывы полацкага епіскапа Савы і з дазволу Сіноду ў 1870 годзе з Кіева была перавезена ў Полацк – у Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, дзе застаўлена ў збудаваным яшчэ Ефрасінняй храме Хрыста Збавіцеля [19, с. 12; 20, с. 81–82]. Штогод у дзень памяці святой, 23 мая, адпаведным крыжовым ходам святкавалася таксама і перанясенне Крыжа Ефрасінні Полацкай, што ўпершыню мела месца ў 1841 годзе [21, с. 18].

Сам акт перанясення мошчаў Ефрасінні ў Полацк не быў з'явай выпадковай. Перад тым як атрымаць канчатковы дазвол кіеўскага мітрапаліта і Сінода на перанос астанкаў святой, полацкія іерархі займелі падтрымку місіянерскага з'езда ў Кіеве ў 1908 годзе, "признавшего в качестве одной из весьма важных и необходимых мер борьбы с католичеством в северо-западном крае перенесение мощей преподобной Ефросинии из Киева в Полоцк…" [20, с. 61]. Дадзенае рашэнне зацвярджалася асабіста Мікалаем II [21, с. 12]. Перанясенне адбылося вясной 1910 года. Пачаткова белы параход, упрыгожаны зелянінай і кветкамі, вёз раку з мошчамі святой па Дняпры. Яшчэ тры параходы суправаджалі святыню. Плаванне па Дняпры працягвалася 12 дзён з прыпынкамі ў Любечы, Рэчыцы, Рагачове, Быхаве, Магілёве і Оршы. Ва ўсіх месцах прыпынку флатыліі здзяйсняліся ўрачыстыя набажэнствы, на носе парахода была збудаваная малельня з люстранымі вокнамі. З Оршы святыню з крыжовым ходам панеслі ў Віцебск, а пасля ў Полацк. З гэтай нагоды ў горадзе сабралася вялізарная колькасць народу. Сярод удзельнікаў урачыстасці 1910 года былі вялікі князь Канстанцін Канстанцінавіч Раманаў, каралева Грэцыі Вольга, сыны вялікага князя Канстанціна Канстанцінавіча князі Алег і Ігар Раманавы, вялікая княгіня Лізавета Фёдараўна, архіепіскап Мітрафан (Краснапольскі), протаіерэй Мікалай Акаловіч, протаіерэй Міхаіл Мітроцкі і інш. Само ж святкаванне пасля было даволі падрабязна апісана ў адпаведнай літаратуры.

Святочныя мерапрыемствы часам набывалі палітычную афарбоўку: у 1865 годзе чатырох кадэтаў выдалілі за спяванне "польского революционного гимна" [11, с. 241]. З нагоды руска-японскай вайны 1904–1905 гадоў у Полацку мелі месца патрыятычныя маніфэстацыі. 19 лютага 1904 года каля гадзіны дня калона вучняў гарадскога вучылішча, чалавек у 30–40, несучы наперадзе партрэт імператара, са спевамі гімна паказалася з-за вугла Пакроўскай вуліцы і накіравалася да плошчы. Моцны энтузіязм ахапіў натоўп, калі на балкон вучылішча быў вынесены партрэт імператара і пачуліся гукі гімна. Нягледзячы на такі патрыятычны ўздым, чыноўніцтва моцна адчувала яго штучны характар, таму імкнулася выкарыстоўваць яго ў мэтах умацавання палітычнай стабільнасці: палкоўнік Паўтарацкі, які выйшаў на балкон, у сваёй прамове да натоўпу выказаў думку адносна таго, што ў такі значны для Расіі момант усе павінны

злучыцца ў адзінае цэлае і забыць свае нацыянальныя супярэчнасці. "Сегодня в манифестации участвовали русские, поляки и евреи. Сохраняя каждый свою национальность, верь, во что хочешь, но будь верным слугою Царю и Отечеству" [11, с. 331–333]. Наогул, у час рэвалюцыі 1905–1907 гадоў грамадства Полацка моцна палярызавалася, што дазволіла выявіць межы афіцыйнай і неафіцыйнай святочнай культуры. Калі ў выніку выдання маніфеста 17 кастрычніка 1905 года па краіне прайшлі масавыя беспарадкі, Полацк, значную частку насельніцтва якога складалі рабочыя-яўрэі, таксама прыняў у гэтым удзел. У гэтыя дні пэўныя катэгорыі насельніцтва не выходзілі на вуліцы з-за дэманстрацый, якія праходзілі на галоўных вуліцах і плошчы, у адрас настаўніцкай семінарыі і кадэцкага корпуса ляцелі пагрозы, а саміх навучэнцаў маніфестанты называлі "опричниками". У адзін са святочных дзён у Полацку сабралася яго "русское" насельніцтва, якое арганізавала сваю дэманстрацыю ў падтрымку ўлады. Калі дэманстрацыя з партрэтам імператара і аркестрам прайшла па плошчы і рушыла па галоўных вуліцах, па ёй пачалася стральба і маніфестацыя скончылася трагічна. Пасля гэтага чырвоныя сцягі і рэвалюцыйныя песні зніклі, і жыццё горада нармалізавалася [11, с. 352].

Значнай праблемай святочнай культуры заходніх губерняў Расійскай імперыі было сумяшчэнне эканамічных і рэлігійных свят. Так, у 1881 годзе Віктарыян, епіскап Полацкі і Віцебскі пісаў да віцебскага губернатара ліст з прашэннем аб адмене таргоў у нядзельныя і святочныя дні [22, с. 409–410]. Адносна эканамічнай асновы свята гістарычная традыцыя беларускіх гарадоў мела глыбокія карані, якія склаліся яшчэ да ўключэння гэтых земляў у склад Расійскай імперыі. Сутнасць гэтай традыцыі заключалася ў тым, што гістарычна ўсе кірмашы, гандлёвыя аперацыі і кантрактныя дамовы былі прымеркаванымі да свят хрысціянскага календара, дзён памяці святых [23, с. 90–91]. Традыцыя ўзнікла яшчэ ў сярэднявеччы і працягвала сваё існаванне ў часы Рэчы Паспалітай: у гарадах (асабліва маючых магдэбургскія прывілеі) кірмашы і фэсты прызначаліся штогадова ў тыя самыя дні. Такая сітуацыя мела вельмі простую і зразумелую прычыну: з-за адсутнасці рэкламных магчымасцей паспяховае функцыянаванне такіх свят магло быць паспяховым і шматлюдным толькі пры іх стабільнасці – калі навакольнае насельніцтва і гандляры аддаленых гарадоў ведалі загадзя, дзе і калі святы будуць мець месца. Хрысціянскі каляндар выкарыстоўваўся для зручнасці: рэлігійнасць была вызначальнай рысай тагачаснага грамадства, а царква і касцёл – яшчэ і месцамі інфармацыйнай камунікацыі паміж людзьмі. У часы Рэчы Паспалітай гарадскі святочны графік размяркоўваўся наступным чынам: першая палова дня (часам толькі ранак) звычайна прызначалася для наведвання царквы (касцёла), адпраўлення рэлігійных патрэб, тады як у другую палову выходзілі на рынак, наведвалі святочныя мерапрыемствы, гандлявалі на кірмашы.

З развіццём капіталізма фабрычнае заканадаўства хоць і значна зменшыла колькасць святочных дзён, але вымушана было лічыцца з наяўнасцю цэлага шэрага рэлігійных свят. Так, у пачатку XX стагоддзя ў Полацку існавала табачная фабрыка Рыўліна. Паколькі пачаткова ўсе працоўныя былі яўрэямі, напярэдадні іўдзейскіх свят і суботы праца скончвалася ў 16.00 летам і 14.00 зімою. У нядзелю працавалі толькі пасля 14.00 (па заканчэнні службы ў праваслаўнай царкве). У святочныя дні (як іўдзейскія, так і хрысціянскія) фабрыка не працавала (27 дзён у год). Рэчаіснасць свята, вядома, часам выходзіла за каляндарныя рамкі, як гэта было 30 красавіка 1910 года, калі 8 рабочых-хрысціян прасілі ўладальніка фабрыкі аб магчымасці прыняць удзел у пераносе мошчаў Ефрасінні Полацкай [15, с. 36].

Такім чынам, вынікае што ў Расійскай імперыі Полацк сярод астатніх гарадоў Паўночна-Заходняга краю займаў асаблівае месца як горад з летапіснай гісторыяй, адно з першых дзяржаўных утварэнняў на гэтых землях, якое, да таго ж, мела некалі моцныя гандлёвыя, культурныя і рэлігійныя сувязі з Візантыйскай імперыяй. Расійская імперыя, якая па шэрагу пазіцый прэтэндавала на пераемнасць з Візантыяй, бачыла ідэалагічную ролю Полацка як аднаго з цэнтраў праваслаўнай ідэі, паколькі горад з тысячагадовай традыцыяй некалі валодаў моцнай палітычнай уладай і побач з Кіевам і Ноўгарадам з'яўляўся адным з першых хрысціянскіх цэнтраў на ўсходнеславянскіх землях. Святочная культура Полацка ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя адрознівалася ад святочных традыцый у іншых гарадах Расійскай імперыі. На неафіцыйным узроўні гэта праяўлялася ў наяўнасці некалькіх этнаканфесійных груп у горадзе (кожная з якіх практыкавала ўласную святочную культуру) і зыходзячых з гэтага адрозненнях. На афіцыйным узроўні святочнай культуры таксама назіраліся выразныя адрозненні, якія вынікалі са святкавання Полацкам не толькі асноўнай, "агульнаімперскай" групы святочных мерапрыемстваў (царскія дні, шматлікія гістрычныя юбілеі), але і шэрага спецыфічных свят, характэрных выключна для рэгіёна (50-гадовы юбілей ліквідацыі Брэсцкай царкоўнай уніі, юбілеі далучэння земляў былой Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі і інш.) і горада (перанос мошчаў Ефрасінні Полацкай). Разам з гэтым для Полацка (як і для шэрага іншых гарадоў заходніх губерняў) былі ўласцівы пэўныя культурныя асаблівасці свят, якія мелі карані ў гістарычным мінулым, святочнай традыцыі часоў Рэчы Паспалітай.

## ЛІТАРАТУРА

1. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии в XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / А.С. Котлярчук; Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого РАН. – СПб., 1999. – 20 с.

2. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии в XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – СПб.: Петерб. востоковедение, 2001. – 240 с.
3. Мазаев, А.И. Праздник как социально-художественное явление / А.И. Мазаев. – М.: Наука, 1978. – 391 с.
4. Паренчук, Т.Н. Праздничная культура современной России в контексте урбанизации: автореф. дис. … канд. культур. наук: 24.00.01 / Т.Н. Паренчук; Омский гос. ун-т. – Кемерово, 2008. – 17 с.
5. Żygulski, K. Święto i kultura / Kazimerz Żygulski. – 1981. – 410 s.
6. Яшчанка, А.Р. Гомель у другой палове XIX – пачатку XX ст.: гісторыка-этнаграфічны нарыс / А.Р. Яшчанка. – Гомель, 1997. – 80 с.
7. Соркіна, І.В. Святочная культура мястэчак Беларусі / І.В. Соркіна // Arche. – 2011. – № 7–8. – С. 112–137.
8. Соркіна, І.В. Гістарычная палітыка ў Гродне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паводле матэрыялаў архіўных фондаў мясцовай адміністрацыі / І.В. Соркіна // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 291–311.
9. Воронич, Т. Общественные инициативы жителей Витебска на рубеже XIX–XX вв. / Т. Воронич // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. артыкулаў / Гродз. дзярж. ун-т; рэдкал.: І.П. Крэнь, І.В. Соркіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2007. – С. 279–285.
10. Некрылова, А.Ф. Русские народные городские праздники, увеселения и зрелища. Конец XVIII – начало XX века / А.Ф. Некрылова. – СПб.: Искусство, 1984. – 191 с.
11. Викентьев, В.П. Полоцкий кадетский корпус. Исторический очерк 75-лет его существования (1835–1910) / В.П. Викеньтьев. – Полоцк, 1910. – 456 с.
12. Псков праздновал 300-летнюю годовщину // Литовские епархиальные ведомости за 1881 год. – Вильно, 1882. – С. 341–342.
13. Жук, А.В. Праздничные и неприсутственные дни Российской империи конца XIX – начала XX в.: учеб. пособие / А.В. Жук. – Омск, 2008. – 92 с.
14. Открытие учительской семинарии в г. Полоцке: 24 сент. 1872 г. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1872. – 31 с.
15. Путеводитель по городу Полоцку 1910 года: к торжеству перенесения святых мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, из г. Киева в г. Полоцк / сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. – Полоцк: Полоц. книжн. изд-во, 2009. – 45 с.
16. Торжество 50-летия воссоединения униатов с православной церковью: 8-е июня 1889 г. в Вильне и др. местах Западной России. – Вильно: Губ. тип., 1889. – 356 с.
17. Лужинский, В. Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого / В. Лужинский. – Казань: Казанская духовная акад., 1885. – 312 с.
18. Церковные торжества в Полоцке и Витебске // Литовские епархиальные ведомости за 1889 год. – Вильно, 1890. – С. 308–311.
19. Дубровский, М. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в г. Полоцке женского монастыря и находящейся в нем святыни / М. Дубровский. – Полоцк, 1885. – 34 с.
20. Жизнь и подвиги преподобной Евфросинии Полоцкой. – М.: Тип. И.Д. Сытина: 1910. – 108 с.
21. Дубровский, М. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой: к торжеству перенесения святых мощей пресвятой Евфросинии из г. Киева в г. Полоцк / Михаил Дубровский. – СПб.: Полоц. церк. братство во имя св. Николая и преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, 1910. – 19 с.
22. Письмо преосвященного Викториана, епископа Полоцкого и Витебского, к витебскому губернатору об отмене базаров в воскресные и праздничные дни // Литовские епархиальные ведомости за 1881 год. – Вильно, 1882. – С. 409–410.
23. Великий пост, пассии и святая в г. Дисне в былое время // Литовские епархиальные ведомости за 1892 год. – Вильно, 1893. – С. 90–91.

*Паступіў 26.04.2013*

## FESTIVE CULTURE OF POLATSK IN THE SECOND HALF XIX – BEGINING XX CENTURIES

***S. RAMANAU***

*In this article the author examines the festive culture of Polotsk in the second half of the XIX – early XX centuries. The place and role of the ideological revaluation Belarusian provinces of the Russian Empire after the rebellion of 1863–1864 by cultivating new festive traditions. The structure, types and forms of city festives, their value orientation. Identifies those festives that for Polotsk had special significance. The article identifies and analyzes the various reasons of celebration, the similarities and differences between the festives groups, ethno-religious, political, and cultural specificity of these holidays. The findings are the key ideas of articles, defined the leading trends and characteristics of Polotsk festive culture in the second half of the XIX – early XX centuries.*